Патаповіч В.А., студ. гр. 514 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гуд П.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# ФЕСТЫВАЛЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР: ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Праблема самавызначэння для кожнай нацыі была актуальна ва ўсе часы. Родную мову, традыцыі, звычаі – культуру свайго народа чалавек увабірае з маленства. Развівацца ў рэчышчы сваей культуры – гэта неад'емнае права кожнага чалавека.

Гісторыя захавала шмат фактаў, калі гэтае права адбіралі. Нямала канфліктаў адбывалася з-за зняважлівага стаўлення, непаразумення прдстаўнікоў тытульнай нацыі да нацыянальных меншасцяў. Пажарышчы этнічных войнаў не раз палыхалі на прасторах многіх краін. Нажаль і сення гэтыя канфлікты маюць месца: абхазска-грузінскі канфлікт, руска-чачэнскі, французска – арабскі і інш.

Гістарычна так склалася, што Беларусь мае паліэтнічны склад насельніцтва. Гэтаму спрыяла не толькі геаграфічнае распалажэнне дзяржавы, але і дабразычлівасць, талерантнасць яе жыхароў. Гэта дазволіла мірна суіснаваць побач беларусам, яўрэям, татарам, палякам, украінцам і інш.

Павага да іншых народаў, пачуцце нацыянальнай годнасці і зараз з’яўляюцца асновапалагаючымі ў пытаннях узаемадзеяння і сумеснага развіцця прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія пражываюць на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Сенняшняе свята нацыянальных культур можна лічыць своеасаблівым вынікам сумеснага існавання народаў розных нацыянальнасцей на тэрыторыі нашай краіны.

Адметнай асаблівасццю фестываля з’яўляецца яго паэтапны характар: правядзенне раённых, гарадскіх, абласных, рэгіянальных фестываляў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заключныях мерапрыемстваў у г. Гродна. У наш час народныя традыцыі захоўваюцца, у большасці сваей, на вёсках. Таму рэгіянальня туры не толькі даюць магчымасць зацікавіць вялікую колькасць людзей актыўнай прапагандай нацыянальных культур розных народаў, але і дазваляюць пабачыць і дакрануцца да яе жыхарам горада.

Пашырэнне геаграфіі фестывалю стымулюе актыўную дзейнасць нацыянальных аб’яднанняў, у выніку чаго былі праведзены: свята нацыянальных культур трох народаў “Спявай, душа славянская”, дні армянскай культуры ў г.Магілеве, міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 200-годдзю з дня з’яўлення ў друку старажытнага эпаса “Слова пра паход Ігара” у г. Гродна і інш.

Нельга не адзначыць тое, што ў фестывалі нацынальных культур прымае ўзел значная колькасць дзяцей і моладзі, што свечыць аб зацікаўленасці іх у развіцці сваей народнай культуры.

У фестывалі прымаюць удзел мастацкія калектывы нацыянальных культурна-асветніцкіх аб’яднанняў, рознага тыпу устаноў культуры, школ і пазашкольных устаноў, прафесійныя калектывы, асобныя выканаўцы, народныя майстры, прадпрыемствы грамадскага харчавання з нацыянальнымі кухнямі, а таксама мастацкія калектывы абшчын бежанцаў і вымушаных перасяленцаў, якія знайшлі другі дом у Беларусі. Пад час фестывалю арганізуюцца выступленні і творчыя справаздачы нацыянальных калектываў мастацкай самадзейнасці; фестывалі музыкі, песні, танца, дні культуры, народныя святы, выставы мастакоў, народных рамёстваў, нацыянальных кухняў, кніг на нацыянальных мовах, паказы нацыянальных гульнёвых праграм, відэафільмаў, конкурс народнага гумару і г.д.

Колькасць удзельнікаў узрастае ад фестываля да фестываля: у І-м фестывалі прынялі ўдзел 11 нацыянальнасцей, у VII – 24 ( больш за 2000 чалавек), лаўрэатамі сталі 734 творчых калектыва нацыянальна-культурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’яднанняў рэспублікі; на рэгіянальных этапах агляда-конкурса VII фестывалю сваю творчасць прадстаўлялі 30 нацыянальнасцей з 66 населеных пунктаў ( 38 гарадоў і 28 вёсак). [5, с. 4-7]

Праграма фестываля працягам 2-3 дні складаецца з 30-40 мерапрыемстваў і рэгулярна абнаўляецца. Цэнтральная дзея фестывалю – работа нацыянальных падворкаў, дзе кожнае нац. аб’яднанне паказвае гісторыю свайго нараджэння і развіцця, дасягненні ў розных сферах матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Праграма кожнага падворка складаецца з: фотавыстава, выставы друкаванай прадукцыі членаў нацыянальных аб’яднанняў, вырабаў народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, выстава-дэгустацыя страў нацыянальнай кухні, музычна-паэтычная праграма “Беларусь – наш агульны дом”, фальклорная праграма, нацыянальны сямейны абрад, свята паэзіі, праграма нацыянальнага гумару, эстрадны канцэрт, нацыянальныя гульні і забавы, мультымедыяпраграма “Нашы фестывалі” і інш. У рамках фестывалю нарадзіўся музычны форум народаў Беларусі, вандроўнае татарскае свята “Караван-Байрам”, малдаўскае свята “Мэрцішор”, азербайджанскі “Навруз-Байрам”, міжнародны армянскі фестываль “Карот-Міасін”, фестывалі польскай, украінскай песні, яўрэйскай культуры і г.д. [3, с. 46]

Мэтанакіраваная палітыка дзяржаўнай падтрымкі культуры прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія жывуць у Беларусі, дае ім магчымасць і шырокія правы захоўваць гісторыю і культуру сваёй нацыі, іх этнічную самасвядомасць і самабытнасць. Існаванне ўнікальнага свята нацыянальных культур мае велізарнае значэнне для развіцця і захавання тадыцый розных нацыянальнасцей, пражываючых на тэрыторыі нашай краіны.

Фестываль нацыянальных культур штогод дэманструе непаўторнае шматнацыянальнае мастацтва Беларусі: народныя звычаі, нацыяннальную кухню, гульні, удасканальваецца структура правядзення свята, становіцца больш яскравай, насычаецца новымі цікавымі мерапрыемствамі. Вельмі значнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'явай становіцца тое, што прадстаўнікамі розных нацыянальнацей арганічна засвойваюцца беларускія традыцыі. Зразумела, што і культура Беларусі ўзбагачаецца за кошт такога ўзаемадзеяння. Не выпадкова тое, што удзельнікамі фестывалю з'яуляюцца прадстаўнікі нацыянальных дыяспар у межах Беларусі – гэта дазваляе прадэманстраваць культурныя набыткі развіцця розных народаў менавіта ва ўмовах нашае дзяржавы. Усе народы, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі маюць агульную багатую спадчыну, агульную гісторыю, ва ўсе часы яны крочылі побач і дапамагалі адзін-аднаму ў складаных абставінах. Сенняшняе свята нацыянальных культур – гэта мадэль адносінаў у нашай краіне прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, што з'яўляецца вынікам не аднаго стагоддзя ўзаемнай павагі і паразумення. [6, с. 7-9]

Свята адпавядае палітыцы дзяржавы ў дадзенай сферы грамадскага жыцця, адлюстроўвае імкненне да міжнацыянальнага даверу і згоды паміж прадстаўнікамі нацыянальных груп, якія пражываюць у Беларусі.

Спіс літаратуры:

1. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы: матэрыялы V міжнар. канф.студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, Мінск, 20 сакав. 1996 г. / Цэнтр імя Ф.Скарыны ; рэдкал.: Л. М. Кулажанка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1996. – 176 с.
2. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 270 с.
3. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Беларуси XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – Спб.: "Петербургское востоковедение", 2001. – 240 с.
4. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: летнее-осенние праздники /А.В. Салова [и др.]. – Минск : Юнипрес, 1978. – 480 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Маёраў, М.К. Гродна вітае сяброў! / М.К. Маёраў // Мастацтва. – 2004. – № 5. – С. 9-11.
6. Макеева, Г.М. Фестываль нацыянальных культур – свята для ўсіх! / Г.М. Макеева // Мастацтва. – 2005. – №5. – С. 4-7.
7. Нацыянальныя меншасці Беларусі: зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Цэнтр. науч. б-ка ; рэдкал.: К.В. Мельнікаў (ад. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – 68 с.
8. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік / С.А. Парашкоў. – Магілеў : Дом, 2001. – 296 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ